**ЗОЯ ЗАІКА (г. Брэст)**

## З ТВОРЧАЙ ЛАБАРАТОРЫІ Г. М. МАЛАЖАЙ

У аснову сучаснай праграмы па беларускай мове для агульнаадукацыйных школ з рускай мовай навучання пакладзена антрапацэнтрычная канцэпцыя выкладання беларускай мовы, галоўнымі задачамі якой з'яўляюцца: сфарміраваць лінгвістычнае мысленне вучняў; спрыяць выхаванню нацыянальна свядомай моўнай асобы з прадуктыўным мысленнем, актыўнай жыццёвай пазіцыяй; закласці трывалыя асновы беларускага маўлення; сфарміраваць асноўныя камунікатыўныя веды, "якія забяспечваюць актывізацыю маўленчай дзейнасці вучняў" [1, с. 23-24].

Новая канцэпцыя навучання патрабавала і новых падыходаў у вывучэнні граматычных з'яў. Прафесар кафедры беларускага мовазнаўства Г.М. Малажай адразу ж адгукнулася на прапанову Нацыянальнага інстытута адукацыі падрыхтаваць новыя падручнікі і дапаможнікі па беларускай мове для 6 і 7 класаў для 11-гадовай школы з рускай мовай навучання, а пазней – для 12-гадовай школы з рускай мовай навучання. Пад кіраўніцтвам Г.М. Малажай тэрмінова былі створаны аўтарскія калектывы: 6 клас (11-гадовы тэрмін навучання) – Малажай Г.М., Рачэўскі С.Р., Кавалевіч З.М; 7 клас (11-гадовы тэрмін навучання) – Малажай Г.М., Заіка З.М., Чалюк Н.М. У 1993 годзе выйшаў падручнік для 6 класа, а ў 1994 годзе – для 7 класа.

У гэты час актывізавалася метадычная думка педагогаў розных краін, у тым ліку і педагогаў Беларусі. Узнікалі і апрабіраваліся ў навучальным працэсе новыя методыкі навучання (або, як іх цяпер называюць, новыя тэхналогіі). Г.М. Малажай не адстае ад часу, і пры гэтым у сваёй творчай педагагічнай працы не забывае ўлічваць метадычную айчынную спадчыну, у першую чаргу, погляды Я. Коласа на ролю ўрокаў роднай мовы ў вучэбна-выхавальным працэсе. На думку Я. Коласа, "навучальны працэс не можа абмяжоўвацца выключна адукацыйнымі мэтамі і задачамі, ён павінен быць цесна звязаны з выхаваннем асобы" [2]. Тытанічную працу па стварэнні падручнікаў і кіраўніцтве творчай навукова-

метадычнай групай узяла на сябе Г.М. Малажай. Галіна Мікалаеўна скрупулёзна адбірала і ацэньвала матэрыялы і заданні да практыкаванняў. Працавала вельмі хутка, дбаючы пра тое, каб у тэрмін здаць рукапіс, таго ж патрабавала ад усіх членаў творчай групы.

Новая канцэпцыя скіравана на вывучэнне граматычных з'яў на сінтаксічнай аснове. Галіна Мікалаеўна лічыла, што змест тэкстаў дыдактычнага характару павінен адлюстроўваць асноўныя рысы ментальнасці беларускага народа. Тэксты павінны спрыяць выхаванню ў школьнікаў такіх хрысціянскіх каштоўнасцяў, як любоў да Радзімы, да роднай зямлі, добразычлівасць, міласэрнасць, спагадлівасць, узаемападтрымка, і пры гэтым адпавядаць высокай мастацкасці.

С.Р. Рачэўскі ў рэцэнзіі да падручніка "Беларуская мова. 8 клас" (аўтары: Малажай Г.М., Заіка З.М., Чалюк Н.М.) адзначыў: "Маўленчы матэрыял, падабраны аўтарамі падручніка, спрыяе выхаванню павагі да нацыянальнай святыні, раскрывае сутнасць беларускага ладу жыцця, багаты свет традыцый нашага народа, вучыць выпрацоўваць грамадзянскую пазіцыю". Якуба С.М. у экспертным заключэнні да падручніка адзначае, што "практыкаванні да падручніка выхоўваюць патрыятычныя пачуцці, любоў да вялікай і малой радзімы, пашыраюць кругагляд школьнікаў, дапамагаюць усвядоміць нормы паводзін у вучнёўскім калектыве, у сям'і".

Малажай Г. М. ставіла задачу перад аўтарскім калектывам: заданні да практыкаванняў павінны быць скіраваны адначасова і на развіццё моўных і маўленчых уменняў і навыкаў, на засваенне моўных і маўленчых нормаў, і таму асаблівая ўвага павінна надавацца практыкаванням аналітычнага і сінтэтычнага характару, што патрабуюць уменняў аналізаваць моўны матэрыял. У розныя гады сваёй працы ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна Г. М. Малажай звярталася да пытання міжпражметных сувязяў. Яна была перакананая, што міжпрадметныя сувязі з'яўляюцца найважнейшым сродкам фарміравання светапогляду вучняў, спрыяюць глыбіні і трываласці ведаў, гнуткасці іх прымянення, садзейнічаюць выхаванню ў школьнікаў устойлівых пазнавальных інтарэсаў. Разам з Ляшук В. Я. у 1992 г. выйшла іх агульная праца для студэнтаў і настаўнікаў. Зразумела, Г.М. Малажай непакоіў стан беларускай мовы на этапе яе існавання ў складанай білінгвістычнай сітуацыі. Гэтай праблеме надавалася асаблівая ўвага падчас напісання падручніка, і таму значнае месца ў падручніку адводзіцца практыкаванням, у якіх выяўляюцца патэнцыяльныя крыніцы генетычнага, супастаўляльнага і функцыянальнага характару міжпрадметных сувязяў з рускай мовай. Пры гэтым, лічыла Г. М. Малажай, неабходна ўлічваць прынцып часавай паслядоўнасці, рэтраспектыўныя, сінхронныя, перспектыўныя сувязі.

Адным з асноўных відаў практыкаванняў, што прадугледжваюць узаемасувязі ведаў з беларускай і рускай мовамі, з'яўляюцца пераклады, якія фарміруюць уменні дыферэнцаванага выкарыстання абедзвюх моў, спрыяюць усвядомленаму практычнаму засваенню ведаў у абедзвюх мовах, узбагачаюць слоўнік, развіваюць мову і маўленне.

Творчая спадчына Г. М. Малажай, нястомнага, сумленнага навукоўца, педагога-метадыста, спрыяе развіццю і ўзбагачэнню мовазнаўчай навукі ў Беларусі. Яе навуковая і метадычная дзейнасць служыць узорам для сучасных настаўнікаў і навукоўцаў.

Спіс літаратуры

1 Праграма для агульнаадукацыйнай 11-гадовай школы з рускай мовай навучання. 1994/1995.
2 Колас, Я. Методыка роднай мовы : зб. твораў / Я. Колас. – Т. 12. – С. 321.